**Урок 31, дата_______ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ 4 КЛАС**

**ТЭМА:** Легенда”Адкуль песня беларуская”; А.Грачанікаў. ”Народ і песні”

**МЭТА:** на практычным узроўні засвойваць значэне слова легенда;
вучыць вызначаць у легендзе народныя выразы;
узнавіць раней набытыя веды вучнў пра беларускую песню;
развіваць уменне вызначаць эмацыянальны настрой паэтычнага твора, вобразныя словы ў ім, яго тэматыку і асноўную думку.
развіваць уменне параўноўваць творы мастацкага слова з творамі жывапісу.
фарміраваць уменне вызначаць аўтарскія адносіны да героя верша.
адзначаць у легендзе цікавасць і захапленне беларусаў таямніцай паходжання і шматгуччам народнай песні.звярнуць увагу на паэтычнае разважанне ў вершы пра ролю песні ў жыцці народа і прыроды, на заклік паэта цікавіцца песняй і заўсёды выконваць яе.

**Абсталяванне:**падручнік, запіс песен, крыжаванка

## ХОД УРОКА

## I.АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ

—Прывітанне!

Пачынаем урок з гульні. Калі вы са мной згодны, гаварыце “так”.

Мову родную шаную. (Так.)
На уроку не сумую. (Так.)
І выдатна я працую. (Так.)

***Дэвіз урока:***

Будзем добра працавадь
І не будзем сумаваць!

## II. МАЎЛЕНЧАЯ РАЗМІНКА

***1. Дыхальная гімнастыка***

***2. Прачытайце вершА.Гаруна. Правільна вымаўляйце гукі [г], [ ц'], [ч], [р]***

Гэй ты, маці, родна мова,
Гэй ты звон вялікі, слова,
Звон магучы,
Звон бліскучы,
З срэбра літы,
З злота збіты,
Загрымі ты,
Загрымі!

А.Гарун

-Растлумачце сэнс гэтых радкоў.
-Які звон чуецца ад роднай мовы?

## III. ПАВЕДАМЛЕННЕ ТЭМЫ І МЭТЫ РАЗДЗЕЛА

-Сёння мы пачынаем новы раздзел.Давайце прачытаем, як ён будзе называцца?
-Што мы адносім да мастацтва?
-Разгледзім малюнак да нашага раздзела.
-Што мы бачым на гэтым малюнку?(аналізуем)
-Як гэты малюнак звязаны з назвай нашага раздзела?
-Прачытаем словы А.Дудара.(чытанне і асэнсаванне паэтычных радкоў)

- Дык скажыце, якія творы  мы будзем вывучаць ў гэтым раздзеле?(дзеці называюць)
- Прачытаем на с. 104 чаму мы будзем вучыцца ў гэтым раздзеле?
-У гэтым раздзеле мы працягнем знаёміцца з гісторыяй, культурай і традыцыямі, якія цяжка зразумець і асэнсаваць без адчування роднага слова.
-Вы сказалі, што да вялікага свету мастацтва адносіцца жывапіс. А давайце ўспомнім, якія асноўныя жанры выяўленчага мастацтва вы ведаеце?
-А што мы адлюстроўваем у творах нацюрмортнага жанру?
-А вось мастак Дж.Хартлі напісаў незвычайны нацюрморт.Разгледзім, якія мы бачым прадметы на рэпрадукцыі мастака?
-Да чаго адносяцца ўсе гэтыя прадметы?
-Як вы назвалі б карціну?
- А вось Дж.Хартлі назваў “Нацюрморт з прадметаў мастацтва”
-Якія віды мастацтва ўвасабляюць гэтыя прадметы?
-Я вам прапаную разгадаць крыжаванку. Адказы звязаны з рознымі відамі мастацтва.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | с | к | у | л | ь | П | т | у | р | а |
| | | | | | | п | Е | й | з | а | ж |
| | | | | | | э | С | к | і | з | |
| | | | | | т | а | Н | е | ц | | |
| с | і | м | ф | о | н | і | Я | | | | |

1. Від выяўленчага мастацтва, творы якога маюць аб’ёмную форму. Выконваюцца з цвёрдых або мяккіх матэрыялаў. (скульптура)
2. Жанр у мастацтве, прадметам выяўлення ў якім з’яўляецца прырода. (пейзаж)
3. Папярэдні накід да крціны,малюнка(эскіз)
4. Від мастацтва, у якім мастацкі вобраз ствараецца сродкамі пластычных рухаў і рытмічнай змены выразных пастаў цела чалавека. (танец)
5. Вялікі музычны твор для аркестра, звычайна з 3-4 частак, якія адрозніваюцца адна ад другой характарам музыкі і тэмпам.(сімфонія)

-Якое слова атрымалася ў чырвонай рамцы па вертыкалі?
- Да якога віда мастацтва адносіцца песня?
-А вы, любіце лепш слухаць ці спяваць песні?Якія ў вас любімыя песні?

## ІУ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ТЭМЫ І МЭТЫ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ

-Сёння мы будзем гаварыць пра беларускую песню. Песні звязаны з жыццём людзей і рознымі з’явамі прыроды. . Ёсць песні лірычныя і дзіцячыя.У кожнай пары года ёсць свае святы. У час гэтых свят людзі весяляцца, спяваюць песні.Дзеці падрыхтавалі паведамленні пра такія святы і песні, якія спяваліся ў гэты час.
(дзеці робяць паведамленне пра песні зімовага і летняга перыядаў і жартоўныя песні для дзяцей)
-Паслухаем народную песню “Купалінка”. На якое свята спявалі гэтую песню?

(гучыць бел.нар. песня “Купалінка”)

**ФІЗХВІЛІНКА**

**У. РАБОТА НАД ТВОРАМ “АДКУЛЬ ПЕСНЯ БЕЛАРУСКАЯ”**

**Першасны сінтэз**

-Вы пачулі многа беларускіх песен, а як вы лічыце, адкуль узяла пачатак беларуская песня? (дзеці выказваюць свае меркаванні)

- Давайце ўспомнім, які твор мы адносім да легенды?(называецца)

-У якім творы мы сустракаліся з легендай?

-Я прачытаю вам яшчэ адну маленькую легенду, а вы паспрабуеце адказаць на пытанне:

- Адкуль песня беларуская?

**Чытанне настаўнікам легенды**

(дзеці адказваюць)

**УІ. АНАЛІЗ ТВОРА І ДРУГАСНЫ СІНТЭЗ**

**1**. Чытанне тэксту вучнямі (моўчкі)

**2**. Чытанне тэксту ўголас

**3**. Аналіз зместу твора

-Колькі часу ішлі падарожнікі?

-Што іх прымусіла прыслухацца?

-Што пачуў першы падарожнік?

- Што пачуў другі падарожнік?

-Што пачуў трэці падарожнік?

- Як вы лічыце, чаму героі чулі розныя гукі?

- А хто з падарожнікаў пачуў найбольш гукаў?

-Што вы можаце сказаць пра гэтага чалавека?Ахарактарызуйце яго.

**4**. Чытанне “Ланцужком”

**5.**Чытанне па асобах

**УІІ. РАБОТА ПА РЭПРАДУКЦЫІ КАРЦІНЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАКА М.Савіцкага “Калыханка”**

(праводзіцца работа па пытаннях с.106)

- І вясёлыя моманты, і сумныя ў жыцці чалавека, суправаджаюцца песняй.

**УІІІ. РАБОТА НАД ВЕРШАМ А.ГРАЧАНІКАВА “НАРОД І ПЕСНЯ”**

**Першаснае ўспрыманне твора.**

(выразнае чытанне верша настаўнікам)

-Да чаго заклікае аўтар верша?

**Другасны сінтэз**

1. Самастойнае чытанне верша
2. Слоўнікавая работа (калі ёсць для дзяцей незразумелыя словы, тлумачацца)
3. Чытанне твора вучнямі ўголас
4. Аналіз твора па слупках (выкарыстоўваюцца пытанні падручніка,вызначаецца аўтарскі настрой, знаходяцца мастацкія словы, вызначаецца асноўная думка твора)
5. Адпрацоўка навыку чытання твора(выбар тону, тэмпу, вызначэнне лагічных націскаў у радках)

**IX. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКУ.**
**РЭФЛЕКСІЯ**

Песня з намі неразлучна.
Падружыся з песняй гучнай!

-Гэтымі словамі А. Александровіча я хачу падвесці вынік нашага ўрока.

-Закончыце сказы, запісаныя на дошцы.

Сёння я многае даведаўся пра…
Самым цікавым на ўроку было…
Я зразумеў, што…
Самым цяжкім для мяне…

(настаўнік выстаўляе адзнакі за работу на ўроку)

**X. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ**

Падрыхтаваць выразнае чытанне верша і легенды.

Творчае:прыдумаць працяг легенды, знайсці самастойна народную песню